Скуратовіч Марыя,
установа адукацыі
“Мінская дзяржаўная
гімназія-каледж мастацтваў”,
5 “А” клас

**Мая Радзіма - Беларусь**

*Між лясамі ды азёрамі –*
*Лугавіны і палі…*
*Я не ведаю, не ведаю*
*прыгажэйшае зямлі.*
*В. Жуковіч*

Ласкавыя промні пяшчотна дакранаюцца да майго твару, прабягаюць і хаваюцца, зноў вяртаюцца, казытаюць і будзяць мяне цёплым красавіцкім ранкам. Падымаюся з ложка і падыходжу да расчыненага матуляю акна. Чыстае паветра напоўнена пахам хвоі, адчуваецца ледзь улоўны водар пралесак і медуніц, што разгарнулі свае пялёсткі ў Крыжоўскім лесе…

Вось мой родны куточак зямлі. Раскінуўся ён на самым ускрайку аграгарадка Ратамка, у дзесяці кіламетрах ад сталіцы.

Камфартабельныя кватэры размешчаны ў пяціпавярховых дамах, што пабудаваны ўзжоўж рэчкі Ратамкі. Пераскокваючы з каменьчыка на каменьчык, перакідваючы жоўты пясочак празрыствмі хвалькамі, рачулка нясе сваю крыштальна чыстую ваду да Заслаўскага вадасховішча. Нават у моцныя маразы вада ў ёй не замярзае да дна. Праз празрысты слой ільду бачыш тонкі струменьчык, што бяжыць і бяжыць. З паўночна-ўсходняга боку ахоўвае нашыя дамы ад сцюдзёных вятроў вялікі ( мінулым летам там бачылі мядзведзя) хваёвы лес.

А побач, праз шашу Мінск- Маладзечна – Заслаўскае вадасховішча, ці Мінскае мора. Таму, відаць, і названы наш раён Пірс. Мара пра адпачынак на цёплым узбярэжжы неадпускала архітэктараў і дызайнераў, калі працавалі над праектам комплекса. Гэта і прымусіла выкарыстаць “марскі” стыль: вялікія вокны падобныя да ілюмінатараў, аздабленне нагадвае карабельныя мачты, рэі, канаты, якары. Цяга да марскіх падарожжаў выявілася і ў назве вуліц – Марскі Рыф 1, Марскі Рыф 2.

Жоўтым рачным жвіркам прыгожа прыбраны берагі рэчкі Ратамкі. На іх велічна размясціліся лежакі. На іх можна проста пасядзець, адпачыць, а ўлетку – пазагараць на сонейку.

У гэтым малюсенькім куточку Беларусі заўсёды стаіць цішыня, якую парушаюць толькі птушыныя спевы. Увесь год ціնькаюць сінічкі, чырыкаюць вераб’і, падаюць гкчны голас вароны. Часта можна пачуць стук чырвонагаловага дзятліка, які з лесу прыляцеў сюды лячыць старыя елкі. А вясною прачынаюцца лясныя птушкі. Першым вітае надыход дня салаўі: іх неверагоднымі трэлямі напоўнены чаромхавыя кусты. Цэлы дзень не сціхае іх канцэрт.

Цішыня і сакой пануюць тут увесь час. І так хочацца, каб гэты куточак ніколі не мяняўся.Тут ты не толькі жывеш, тут ты адпачываеш душою, сэрцам ад гарадской штодзённай мітусні.

Я спадзяюся, што жыхары гэтага раёна Ратамкі зробяць усё, каб прыгажосць, чысціня, спакой зберагліся тут і перадаліся наступным пакаленням.